Обновлено 16.11.2020 09:14
Опубликовано 12.11.2020 19:07

10 лістапада заняткі са слухачамі факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, што адбываюцца на платформе TrueConf, прайшлі з удзелам прэс-сакратара Міністэрства ўнутраных спраў. Вольга Чамаданава прачытала лекцыю на тэму "Камунікацыйная палітыка ў органах унутраных спраў" у межах дысцыпліны "Карпаратыўная культура і імідж" (выкладчык – начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Сяргей Венідзіктаў). Слухачы з усёй краіны, для якіх сесія праз каронавірус праходзіць дыстанцыйна, атрымалі магчымасць у рэжыме рэальнага часу задаць пытанні і выказаць сваё бачанне сітуацыі ў інфармацыйным полі. У прыватнасці, цікавіла праца Міністэрства ва ўмовах сацыяльных канфліктаў, праблемы павышэння ўзроўню камунікацыйнай культуры супрацоўнікаў і іх інфармацыйнай абароненасці, праца Тэлеграм-каналаў. У фінале гутаркі, што доўжылася больш за гадзіну, Вольга Чамаданава паабяцала: прапановы і меркаванні, якія агучылі слухачы, будуць уважліва разгледжаны.

У гэты ж дзень прэс-сакратар Міністэрства ўнутраных спраў пабачылася з супрацоўнікамі кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Пашыранае пасяджэнне кафедры таксама прайшло ў дыстанцыйным фармаце на платформе TrueConf. Выкладчыкі абмеркавалі з Вольгай Чамаданавай праблемы медыйнай граматнасці супрацоўнікаў міліцыі, ролі СМІ ў ідэалагічных працэсах, магчымыя крокі па фарміраванні станоўчага іміджу ораганаў унутраных спраў.

Навуковыя кантакты ў цяперашніх умовах таксама перайшлі ў online-прастору. Напрыклад, міжнародны навуковы форум "Медыя ў сучасным свеце. 59-я Пецярбургскія чытанні", адбыўся ў Вышэйшай школе журналістыкі і масавых камунікацый Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта на платформе Zoom. Начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Сяргей Венідзіктаў далучыўся да працы круглага стала "СМІ ў сучасных інфармацыйных войнах", а таксама прысутнічаў на плэнарным пасяджэнні канферэнцыі. Па выніках мерапрыемства выйшаў зборнік навуковых прац.

Праца ў online-фармаце ва ўмовах сацыяльнага дыстанцыравання будзе працягвацца. На чарзе – удзел супрацоўнікаў кафедры ў Міжнароднай канферэнцыі "Журналістыка-2020" у Беларускім дзяржаўным універсітэце, якая пройдзе на платформе Zoom.

Па інфармацыі кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
Фота Юрыя КУЛАЖЫНА

Phoca PDF